НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 1000 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць тры разы у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 10000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 1000 мк., сярод тэксту 800 мк. і на 4 стрніцы 600 мк. за радок петиту ў 1 шпальт.

№ 13 **Пятніца 18-га траўня 1923 г.** **Год I.**

Паход процiў беларускiх паслоў.

Вялікае нездаволеньне і небывалы гвалт падняўся сярод польскіх шавіністычных кругоў, калі былі агалошаны вынікі выбароў у Сойм і Сэнат, калі ў ліку меншасьцей прайшло больш дзесятка беларускіх паслоў. Уся польская прэса загаварыла аб несправядлівым галасаваньні на абшарах беларускіх зямель, кідалі каменьнямі, лілі гразь на нашых паслоў, вышуківаліся і фабрыкаваліся спосабы, каб давясьці няпраўнасьць іхніх мандатаў.

Адным словам, прыгатаўлялася адпаведная апінія сярод польскага грамадзянства, якое і без таго ачумела ад ненавісьці процiў меншасьцей. Рабілася усё, каб пазбавіць беларускі народ сваіх прадстаўнікоў, прадстаўнікоў ня толькі ад іншай нацыі, але самае для іх нямілае—працоўнага народу.

Польская пануючая цяпер шляхта ведала загадзя, што, пасьля ўсіх крыўд і ўціску над беларускім народам, яго прадстаўнікі загаворыць яго голасам, а голас гэты будзе крыкам роспачы і рашучых дамаганьняў, будзе дысанансам у іх хвалебных гымнах у чэсьць моцнага кулака.

13-га лютага паявіўся камунікат беларускага Пасольскага Клюбу дзе чытаем:

„1. Рыскі Трактат 18 сакавіка 1921 г. быў зроблены без учасьця і санкцыі ўсяго Беларускага Народу.

2. Справа Віленшчыны, дзе палякі побач беларусаў, літвіноў і жыдоў зяўляюцца меншасьцяй была развязана аднабока праз палякоў, бо ані беларусы, ані літвіны і жыды ўчасьця да выбараў у Віленскі Сойм 8 студня 1922 г. ня прынімалі.

3. Усходняя граніца Польшчы абапёртая на Рыскім трактаце ёсьць тымчасовая і можа быць аканчальна ўстаноўлена згодна з міжнародным правам і ў паразуменьні з цэлым Беларускім Народам".

Пасол Тарашкевіч у прамове аб асадніках з сэрцам сказаў: „Памятайце панове, асьцярагаю вас, што калісь прыйдзе страшная ноч, у якую усе асаднічыя калёніі могуць пайсьці з дымам пажараў, з куравам крыві братняй".

Такое, ненармальнымі варункамі створанае, становішча Беларускага Пасольскага Клюбу (Як вы з намі, так і мы з вамі!) занепакоіла вельможных і, пад скрогат зубоў правіцы, пачаўся адзіным фронтам паход супроць беларускіх паслоў.

І вось выбарнікі працоўных становяцца перад судом, не прызнаецца іх „obywatelstwo", кідаюцца небывала агідныя паклёпы.

Паслы: Баран, Кахановіч, Аўсянік і іншыя стаяць перад пагрозай уневажаньня іхніх пасольскіх мандатаў. Навагрудчыне і Піншчыне пагражаюць перавыбары. А якія яшчэ неспадзяўкі нам гатуюцца—трудна ўгадаць.

Пасьля усяго гэтага родзіцца пытаньне, што рабіць у гэтых выпадках, калі б'юць і крычаць не даюць, калі ідзець пляновае, атрытае ніштажэньне ўсяго беларускага, топчучы сваю канстытуцыю, ламаючы розныя трактаты, калі колькі мільённаму народу не даецца права голасу ў дзяржаўным сужыцьці.

І гэтае неразважнае, віхрастае будаваньне сваей гаспадарсьцьвеннасьці ня ёсьць неякая жыцьцёвая, рэвалюцыйная сіла, якая сваімі ахвярамі акуплівае будучы дабрабыт чалавецтва,—гэта проста шаленства, агонія, самагубства недасьпелых тварцоў людаедзкай палітыкі.

А дзе-ж тая сумленная паліты, аб якой так урачыста заяўляў тварэц сучаснай Польшчы — бышы начальнік дзяржавы?

Няўжо гісторыя мае лішні раз даказаць, што хто чым ваюе, той ад таго гінець?

Выходзіць, што бараніцца апіраючыся на закон, там дзе закон дня нас ня істнуе, рэч безнадзейная і лішняя трата часу.

Як перасьцярогу трэба зазначыць, што беларускі народ ужо раз выявіў сваю волю, выбраўшы ў Сойм і Сэнат сваіх прадстаўнікоў. Пагвалчэньне гэтай волі ня спыніць яго цьвёрдага поступу і бязупыннага імкненьня да сьвету і волі.

Р. Юргілевіч.

Палітычныя падзеі.

Грэцыя. „Deli Express" паведамляе, што ўрад Грэцыі даручыў Вэнізелосу паведаміць саюзьнікаў, што мір павінен быць падпісаны як найхутчэй, у працiўным разе Грэцыя возьмецца за аружжа для абароны сваіх інтарэсаў.

Латвія. Кабінет міністраў у поўным складзе падаўся ў адстаўку. Сфармаваньне новага кабінэту натыкаецца на тыя самыя труднасьці, якія выявіліся яшч ўвосень—на немагчымасьць абыйсьціся без паразуменьня з крайнімі левымі групамі.

Польшча. Прычынай перарыву польска-гданскіх перагавораў, як паведамляе „Kurjer Polski" трэба лічыць вымаганьне Польшчы аб прызнаньні ёй права рашучага голасу ў справе мытных урадоўцаў у Гданску, на што гданская дэлегацыя ня згодзілася, лічучы гэтае вымаганьне ня згодным з парыскімі пастановамі.

Карэспандэнт парыскай газэты «Temps» даючы справаздачу аб паездцы маршалка Фоша, выказвае сваё поўнае задаваленьне з прычыны баявой гатоўнасьці польскае арміі.

Міністэрствам фінансаў уносіцца праект бюджэту на трэці квартал 1923 г. Бюджэт аблічаны ў польскіх злотых. Прыход выносіць 990.148.000 п. зл., расходы 1.700.400.080 п. зл. Дэфіцыт 710.252.000 п. зл. Калі перарахаваць недабор па курсу швайцарскага франка на маркі, дык недабор будзе раўнацца 6.031.142.000.000 марак польскіх!

У Італіі паміж самімі фашыстамі істнуюць непаразуменьні, якіх Мусоліні думае пазбавіцца ўвядзеньнем вайсковай дысцыпліны. Забаронены доступ да партыі фашыстаў новых сябраў, распушчаны выбарны ўрад партыі і створаны новы па назначэньню. Усе фашысты павінны залічацца да войска, каб павялічыць вайсковую сілу.

Вэнгрыя. Урад Хорті праводзіць сваю палітыку, якая бароніць інтарэсы вялікіх магнатаў. Апрацаваны закон, што забясьпечывае вялікую ўласнасьць і скіраваны процiў малазямельных і безьзямельных сялян. Прасьледаваньні работніцкага руху ня спыняюцца. Першамайскія дэманстрацыі не адбыліся, але работнікі ў дзень 1-га мая нідзе не працавалі.

У Злучаных Штатах вядзецца заядлая барацьба паміж аплачываемаю капіталістатычнымі трэстамі буржуазнаю прэсаю а паўстаючаю Работніцкай партыяй Што раз болей работнікаў гуртуецца пад штандарам работніцкай партыі.

Гішпанія. Пры выбарах у парлямэнт у Мадрыце перамаглі сацыялісты, атрымаўшыя з 8-мі 6 мандатаў. Гэта першая перамога сацыялізму на выбарах у гісторыі Гішпаніі.

Забойства Вароўскага.

Прадстаўнік савецкай Расеі ў Лазане Вароўскі забіты праз швайцарскіх фашыстаў. Вароўскі разам з двума другімі расейскімі дыплёматамі Арэнсам і Дывількоўскім вячэралі ў гатэлю „Cecil". У гэты час увайшоў нейкі Конрадi, швайцарац па нацыянальнасьці, але доўгі час пражываўшы ў Расеі, дзе служыў нават афіцэрам у арміях Карнілава і Урангеля, і даў некалькі стрэлаў у сядзеўшых савецкіх дыпляматаў. Вароўскі забіты на месцы. Арэнс і Дывількоўскі цяжка паранены. Як паведамляе „Petit Parisien" ужо колькі дзён перад забойствам хадзілі чуткі аб варожых замерах процiў савецкіх прадстаўнікоў. Швайцарская фашыстоўская арганізацыя „Нацыянальная Ліга Патрыётаў" зьвярнулася да Вароўскага, каб ён выехаў з Швайцарыі і калі Вароўскі ня звярнуў на гэтыя беспадстаўныя дамаганьні увагі, дык яму пагражалі, што справа дрэнна скончыцца.

Газэты паведамляюць, што Савецкі ўрад з прычыны забойства Вяроўскага пастанавіў ануляваць усе выданыя раней швайцарцам канцэсыі ў Расеі. У Маскве забойства выклікала вялікае абурэньне, адбыліся мнагалюдныя маніфэстацыі, ў якіх узялі удзел розныя арганізацыі, прафсаюзы і войска.

Швайцарская сацыялістічная партыя пастанавіла ўнясьці да Нацыянальнай Рады інтэрпэляцыю з прычыны забойства Вароўскага.

Справа пасла Ланцуцкага.

Лодзінская пракуратура зьвярнулася да сойму з жаданьнем аб выданьні пасла Ланцуцкага, процiў якому мае распачацца сьледзтва па абвінавачаньню ў анты-дзяржаўнай агітацыі.

Заграніўныя канцэсыі у Расеі.

Савецкім урадам за апошнія часы выдана шмат канцэсый заграніўным прамысловцам і так-жа зроблена шмат дагавораў на ўвоз і вывоз розных прадуктаў з заграніўнымі фірмамі.

Савецкая прэса аб царкоуным саборы у Расеі.

„Известия" ў стацьці пасьвячонай царкоўнаму сабору, адзначае, што ў царкоўных кругах паяўляецца рух, які імкнецца абнавіць праваслаўную царкву ў інтарэсах яе далейшага істнаваньня. Намячаюцца тры групы: левая старажытна—апостальская царкаў, якая імкнецца абаперціся на гарадзкую і вясковую беднату, цэнтр - жывая царкаў, зьвязаная з сярэднімі гарадзкімі слаямі і правая—група царкоўнага адраджэньня пад кіраўніцтвам Антаніна, якая аб'яднала манахаў рэфармістаў. Намечаецца утварэньне радыкальнай царкоўна—палітычнай партыі, маючай на мэце барацьбу з ціхаваўшчынай і зьбліжэньне з шырокімі слаямі насяленьня Савецкіх Рэспублік.

Царкоўны сабор выбраў вышы савет расейскай праваслаўнай царквы ў складзе 18 асоб, у тым ліку мітрапаліт Антанін і пратаярэй Красьніцкі.

Царкоўны сабор прыняў рэзалюцыю аб увядзеньні сьвяткаваньня праваслаўных сьвят па новаму стылю.

Адкрыцьце залежаў жалеза ў Расеі.

Сусьветнай сенсацыяй дня зьяўляецца раськрыцьце праф. Лазаравым зацікавіўшай вучоныя і прамысловыя сфэры загадкі найбольшай у сьвеце магнітнай анамаліі ў Курскай губ. Разгадцы курскай магнітнай аномаліі прыдаюць вялізарнае значэньне, Дзеля гэтага была арганізована спэцыяльная камісія з пр. Лазаравым, Архангельскім і Губкіным на чале Савецкі ўрад адпусьціў значныя сумы для досьледаў. Заграніўныя капіталісты няраз стараліся атрымаць канцэсыю, але Сав. урад адкідаў усе прапазыцыі і рабіў досьледы беспасрэдна. Як паведамляе праф. Лазараў жалезныя руды надта багатыя і маюць да 70 прац. чыстага жалеза. Абшар залежаў цягнецца на 250 кілёмэтраў. Па думцы некаторых спэцыялістаў Курскія руды найбагацейшыя ў сьвеце. Географічнае палажэньне іх паміж Маскоўскім прамысловым районам і Данецкім вугальным басэйнам таксама маець вялікае значэньне на разьвіцьцё прамысьловасьці ў Расеі.

Бюджэт Францыі.

„Kultura Robotnicza" прыводзіць характэрныя цыфры аб францускім бюджэце.

Згодна з справаздачай парлямэнцкай бюджэтнай камісіі дэфіцыт азначаны найменш 3895 мільёнаў франкаў — гэта ў тым выпадку, калі агульныя даўгі Антанты будуць скасованы, калі адначасна немцы выпаўняць свае забавязаньня і ўрэшце, калі курс франка будзе трывалым. Дзяржаўныя грашавыя патрэбы, якія трэба пакрыць пажычкамі ўрад ацэнівае на 23 мільярды, а справаздаўчая камісія на 35 мільярдаў.

Беларуская этнаграф. экспэдыцыя.

Менскі Народ. Каміс. Асьветы ў гэтым годзе прыступае да шырокага дасьледаваньня Беларусі. У гэтым напрамку ўтворана спэцыяльная этнаграфічная экспэдыцыя, якая займецца, галоўным чынам, над высьледамі матар'яльнай культуру беларускай вёскі.

У экспэдыцыю назначаны: старшынёй—малады беларускі навуковы працаўнік М. В. Мялешка і сябрамі: праф. музыкі Я. Я. Полфераў, член Інбэльту М.В. Азбукін і фаатограф мастак Л. У. Дашкевіч. Таксама запрошан прыняць удзел у экспэдыцыі праф. Кацэнбогін.

У першую экскурсію экспэдыцыю едзе на Ігуменшчыну-

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ у БЕЛАСТОКУ

Першы дзень. *(Ад уласнага карэспандэнта).*

У 11 гадз. 25 мін прадседацель Дыноўскі адчыняе паседжаньне.

Пачынаецца апрос падсудных, што цягнецца паўгадзіны.

Усе падсудныя дзеляцца на дьве часткі: адны, знаходзяцца пад вартай і сядзяць асобка, іх 33 чалавекі, другія ў ліку 12 знаходзяцца на волі ў тым ліку абодва паслы Баран і Якавюк.

Спісак абаронцаў абвешчаны намі трэба паправіць: апрача Врублеўскага, Бабянскага, Міцкевіча, Грушкевіча, Славінскага, аб якіх мы ўжо пісалі, яшчэ Ражанскі, Обедзінзкі, Рэйнгару і Кланк.

Большасьць падсудных маладыя людзі, здаровага энэргічнага віду, шмат у каго, нягледзячы на доўгае прабываньне ў вастрозе, досыць добры выгляд. Толькі ў некаторых відаць моцная зморанасьць. Большасьць трымаецца бадзёрна і спакойна. Па сацыяльнаму палажэньню і прафэсіі абвінавачаныя: народныя вучыцелі, двох быўшых афіцэраў, адзін землямер, адзін фэльшар, рэшта—земляробы, работнікі і дробныя гандляры.

Агульную увагу зварочывае галоўная асоба працэсу Вера Маслоўская, разумная, энэргічная твар якой адпавядае тэй кіраўнічай ролі ,якую яна, не адкідаючы выстаўленых проціў яе абвінавачаньняў, спакойна і проста прызнала за сабою ў сваёй сягодняшняй прамове ў адказ на пытаньні прадседацеля. Гэныя яе паказаньні і ёсьць галоўным мамэнтам першага дня працэсу.

На стале перад судом разложаны „рэчовыя доказы дакананых і маючых быць зробленымі праступленьняў“ каля цзесятка рэзальвэраў розных сыстэмаў, а на падлозе — таксама больш дзесятка старых ржавых стрэльбаў з „складаў аружжа і амуніцыі“, аб якіх гаворыцца ў акце абвінавачаньня.

Кідаецца ў вочы гэтая нестасоўнасьць паміж вялізарным і грозным заданьнем „адарваньня ад Польшчы беларускіх тэрыторый і ўтварэньне з іх Незалежнай Беларускай Рэспублікі“ і гэтых срэдстваў зьдзейсьненьня заданьня.

Прадстаўленнага суду аружжа да дзіўнасьці мала для таго, каб паўстаньне можна было назваць *аружным*—настолькі, каб яно магло пагражаць Польскай Рэспубліцы. . . .

На стале і другія срэдствы барацьбы, знойдзеныя па словам акту абвінавачаньня пры вобыску ў тайнай штаб-кватэры паўстанцаў у Белавежскай пушчы: бутэлька з цыяністым каліем (моцны яд) і стрыхнін. Есьць ручныя гранаты, піраксылінавыя шашкі і інш.

Пры спраўджаньні сьведкаў выявілася адсутнасьць такіх сьведкаў, якія зьяўляюцца надта важнымі для працэсу. У ліку іх усе тыя кіты, на працы якіх пакоіцца ўся будова акту абвінавачаньня: гэта—капітан Д. О. К. 7 у Горадні—Ярэцкі, агент Горадзенскага Urzędu Śledczego Канст. Шыгаловіч, які ўвайшоў у арганізацыю для „унутраннага высьвятленьня“, Гэнрык Погожэльскі старшы пшодовнік Дзярж. Паліцыі ў Варшаве. Бракуе і шэраг меней важных сьведкаў.

З гэтай прычыны вынікае спрэчка паміж абаронай, якая дамагаецца адлажыць справу да вызаву сьведкаў, якія могуць быць вызваны безадкладна. Да гэтай заявы абаронцы Бабянскага далучаюцца ўсе абаронцы.

Пракурор лічыць, што прадстаўленныя *галоўнымі* з адсутных сьведкаў прычына неяўкі зьяўляюцца выстарчаючымі; бяз рэшты, меней важных, суд можа абысьціся, бо іх паказаньня ёсьць у матар'ялах папярэдняга следства.

Суд, выслухаўшы рэплікі старон, удаліўся на нараду і вынес рэзалюцыю—справу слуханьнем прадаўжаць, з тым, што сьведкі Яроцкі і Шыгаловіч будуць вызваны паўторна, а не зьявіўшыяся без выстарчаючых прычын будуць аштрафованы на 20.000 марак, сьведку Погожэльскага неглядзячы на яго служэбнае палажэньне суд не пастанавіў вызваць другі раз з прычыны *невядомасьці Суду яго местапрабываньня* (? !)

Пасьля начынаецца чытаньне акта абвінавачаньня, што займае ўвесь час да перарыва—да 4 гадз.

Акт абвінавачаньня, па прызнаньню нават шмат каго з абаронцаў, састаўлены пракурорам Ясінскім дужа ўдала. Гэта абшырная праца ў 60 старонак уборыстата друку на машынцы.

Галоўны зьмест яго гэткі:

У пачатку 1922 г. экспозытура 5 f Pol. Państw. напала на сьлед шырока раскінутай беларускай арганізацыі, маючай на мэці ўтварэньне пры дапамозе аружнага паўстаньня проціў Польшчы, Беларускай Незалежнай Народнай Рэспублікі. Рух гэты, моцна падтрымліваемы матэрыяльна і маральна праз Ковенскую Літву і часткова праз Нямеччыну, імкнуўся да ўтварэньня на тэрыторыі Ковенскай Літвы рэгулярных аддзелаў беларускіх войск, а на тэрыторыі Польшчы, заселянай беларусамі, значных партызанскіх аддзелаў.

Для гэтай мэты уся арганізацыя мела вайсковы характар і тэрытарыяльна была падзелена на 4 групы, кожная з якіх мела свайго начальніка і штаб. Тэрыторыя кожнай групы дзялілася далей на аддзелы, раёны, сэкцыі і „зьвеньня“, меўшыя сваіх начальнікаў, штабы, афіцэраў для лучнасьці, кур'ераў і партызанаў, вэрбаваўшыхся шляхам агітацыі сярод мяйсцовай беларускай люднасьці.

На чале ўсяго руху стаяў Цэнтральны Беларускі Камітэт у Коўне, прадстаўляемы так званай „групай Ластоўскага“ і называючы сябе „Урадам Незалежнай Беларускай Рэспублікі“.

Горадзеншчына ўваходзіла ў склад 4 групы, на чале якой стаяў атаман Хмара, запраўднае імя якога ёсьць Вячаслаў Разумовіч, паручнік Літоўскай арміі.

Местапрабываньнем Разумовіча і ягонага штабу было літоўскае мястэчка Мэрач на польскай граніцы. Аддуль пасылаліся Хмарай у Горадзеншчыну загады, адтуль прывозілася тайна аружжа для загаворшчыкаў, узрывучатыя матэр'ялы і труцізна—цыяністы калій і стрыхнін, якія празначаліся для ўжытку проціў польскай арміі і паліцыі.

У Мэрач у штаб Хмары пастаянна езьдзілі загаворшчыкі за інфармацыямі, інструкцыямі, з дакладамі службовымі,—за аружжам і грашамі.

Далей акт абвінавачываньня зьвязываець дзейнасьць гэтых арганізацый з зьездам беларусаў у Празе восеняй 1921 г. На зьездзе, па славах акта, было пастаноўлена падняць аружнае паўстаньне супроць Польшчы. Тэрмін паўстаньня быў назначаны на пачатак сакавіка 1922 г., але пасля раскрыцьця арганізацыі і масавых арыштаў беларусаў і учасьнікаў арганізацыі было перанесена на першую палову красавіка. На зьездзе ў Празе прымалі ўчасьце ад Горадзеншчыны В. Маслоўская народная вучыцелька і Сяргей Баранаў.

Маслоўская была галоўнай дзеячкай—агітатарам і арганізатарам паўстаньня ў Горадзеншчыне, а Баранаў, па даных II аддзелу Ген. Штабу, таксама адзін з галоўных дзеячоў паўстанчага руху—будучы прадседацелям Горадзенскага Белар. Нац. К-ту.

Больш падробныя інфармацыі даў жыхар мяст. Саколкі Эдуард Ленкевіч, які ўвашоў у арганізацыю з мэтай, па яго прызнаньню, раскрыцьця яе. Інфармацыі Ленкевіча былі повадам масавых арыштаў і пачатка следзтва па гэтай справе.

Ленкевіч паказаў, што ў пачатку сьнежня 1921 г. крамнік м. Саколка Гораш Александр запрапанаваў яму ўвайсьці у арганізацыю пазнаёміў з Маслоўскай, якая пачала з ім гутарку аб тым быццам палякі прыгнетаюць беларусаў і запрапанавала яму ўступіць у арганізацыю, якая мае на мэце скінуць польскую ўладу і вызваліць беларускі народ, пры гэтым абяцала даць яму мейсца начальніка Сакольскага павету і адпаведную заплату. Ленкевіч даў згоду і Маслоўская зьездзіўшы ў Мэрач (у Літве) у штаб IV групы прывязла яму назначэньне, дала 20.000 марак і уручыла загад Хмары, у якім былі пералічаны абавязкі начальніка павету.

Абавязкі гэтыя абмяжовываліся ў набіраньні маладых людзей ў фармуемую ў Літве беларускую армію, а ў сябе ў павеце партызанскіх атрадаў, зьбіраньні аружжа, у самай падробнай разведцы адносна да ваенных сілаў Польшчы, аб яе ўнутраным палажэньні, ў агітацыі сярод сялян проці польскай улады, падстракаваньнем недавольства насяленьня.

Затым Лянкевіч пакрыху ўваходзіў у справу бліжэй, атрымываў ад Хмары загады і увайшоў у сувязь з шэрагам сяброў групы.

2—II—22 г. да Лянкевіча Гораш прывез Аўгеню Матэйчук, сястру Веры Маслоўскай, якая ўказала яму спосаб праезду ў Мэрач, куды ён быў вызваны, праз нейкага Козіча, Хмараю. Трэба было праехаць у Горадню, адтуль на станцыю Марцінканцы, затым пехатой у Дарывелі, дзе зьявіцца да Мацея Грыгаса, якому трэба сказаць што зьявіўся ад імя сястры Веры. Тады Грыгас правядзе праз граніцу ў Літву. Лянкевіч паехаў ў Горадню, дзе ў беларускай школе ў вучыцеля Аляксандры Парука спаткаўся з Козічам і Карповічам. У апошняга, толькі што вярнуўшагася з Штабу з Мэрачы, было з сабою 3 маўзэры, 4 ручныя гранаты, пістоны для ўзрываньня мін, шапіограф.

У тую ж ноч Ленкевіч паказанаю дарогаю прабраўся ў Мэрач да Хмары, у якога застаў яго начальніка штабу палк. Валошыча.

У наступны дзень у штабе адбылося сабраньне на якім Хмара абрысаваў плян дзейнасьці—каб у рашучы момант падняць паўстаньне і зьвесьці са сьвету прадстаўнікоў польскай улады. Хмара запэўніў *усіх* прысутных, што Літва і Нямеччына падтрымаюць паўстаньне. Літва дасьць аружжа трэба толькі найсьці патаемныя месты дзеля яго захаваньня да патрэбнага мамэнту.

Уся арганізацыя, па Ленкевічу, дзялілася на 4 групы, штабы якіх знаходзіліся: 1) у Коўне (ёй падпарадкаваўся беларускі полк, які стаіць пад Коўнам), 2) у Уцянах, 3) у Аранах і 4) ў Мэрачы. Да апошняй групы і належалі паветы Горадзенскі, Беластоцкі, Сакольскі, Бельскі, Ваўкавыскі і Лідзкі.

Ленкевіч называе гэткіх загаворшчыкаў: Кастуся Матэйчука, брата Аўгені Матэйчук і Веры Маслоўскай, Адама Трыпузу, начальніка Горадзенскага павету, яго памоцніка Ал—ру Парука, беларускага вучыцеля ў Горадні. Клімента Замойда, псаломшчыка ў Саколцы, Сьцяпана Жабінскага, начальніка Ваўкавыскага пав., Германа Шыманюка, які арганізаваў 12 партызанскіх атрадаў па 100 чэлавек у кожным (як далей пабачым гэтыя цыфры зусім фіктыўны); Грыгора Астравецкага, Андрэя Каляду і Сымона Якавюка з Гродны, быццам аднаго з галоўных загаворшчыкаў, які запэўняў у Коўні, што ў яго 80.000 партызанаў, на што атрымаў ад ураду Літвы 70.000 нямецкіх марак, за якія грошы Якавюк быццам купіў у Горадні два дамы, гандляра Гораша, які набіраў маладых хлапцоў у Літву, вазіў аружжа і грошы на агітацыю.

Сьведка Грыгор Міхнюк, увайшоўшы ў арганізацыю высьвятліў уладам працу другога выбітнага дзеяча арганізацыі паўстанцаў Аляксандра Станкевіча, расейскага камуністы, служыўшага ў чырвонай арміі ў конніцы Будзенага, дзе быў палкоўнікам, а пасьля вайны прыехаў у Польшчу і пасяліўся ў Крынках Горадзенскага павету. З'ездзіўшы у Літву да Хмары Станкевіч вярнуўся начальнікам асобнага аддзелу; прывёз адтуль аружжа і абяцаў атрымаць яшчэ 500 маўзэраў, два пуды дынаміту і людзей дзеля ўзрыву шэрагу будынкаў у Беластоку.

У характару рэчавых доказаў і дакумэнтаў Ленкевічам прадстаўлены загады па арганізацыі, шыфр знаходзячыся ў лемантару „Зорка“, якім карысталіся загаваршчыкі, сьпіскі служашчых у арганізацыі з вызначэньнем іх утрыманьня і г. д.

Загадам Хмары № 2 у цэлях лепшай канспірацыі заведзяна—каб усе аддзелы, раёны, сэкцыі насілі назовы як-то: коопэратывы, прасьветныя гурткі, царкоўныя брацтвы і інш. Усе сябры арганізацыі мусяць насіць назовы „сяброў брацтва“.

(Працяг у чародным нумары).

Урад распалагае даходамі 17—19 мільярдаў пры 55—60 мільярдах выдаткаў; афіцыяльна паведамляецца, што дэфіцыт будзе выносіць толькі 24 мільярды, але запраўды будзе шмат больш, а для замаскаваньня праўды служаць т. зв. нямецкія рэпарацыйныя сплаты; дзяржаўныя даўгі што год павялічываюцца на 30 мільярдаў; міністэрства фінансаў выцягнула з краю бадай увесь абаротны капітал; вялізарнае запатрэбаваньне пажычак, рэалізацыя якіх ідзе ўсё трудней; дзяржава задушана даўгамі, і адначасна руйнуецца ваеннымі выдаткамі і разам з тым жадае быць жандарам Эўропы — вось французская сытуацыя ў 1923 г.

Тыя фінансавыя труднасьці, якія прывялі да упадку стары французскі каралеўскі ўрад, нават ня могуць быць параўнаны з тым, што дзеецца цяпер. Як і тады, так і цяпер палова дзяржаўнага даходу йдзе на сплату працэнтаў за даўгі. Узрыў вялікай французскай Рэвалюцыі ў значнай меры падняты быў фінансавымі труднасьцямі.

Гісторыя паўтараецца. Пытаньне толькі ў тым ці сучаснае становішча будзе трываць аж да агульнага правалу ўсяго капіталістычнага сацыяльнага устрою, ці наступіць раней.

З газэт.

Візыт Фоша.

„Земля і Воля“ ў № 20 абгаварываючы паездку маршалка Фоша, які зьяўляецца уасабленьнем ваеннай імпэрыялістычнай палітыкі Францыі, маючай на мэці ўмацаваньне за ўсякую цану французскай гегемоніі на эўрапейскім кантынэнце, апіраючыся на валізарную армію Францыі і яе саюзьніц,—піша, што гэтая паездка набірае асобай вагі, калі прыняць пад увагу прыбліжаньне да канца торгу паміж эўрапейскімі капіталістамі ў справе падзелу паваеннай спадчыны. Гэтая паездка ёсьць пагроза ў бок Нямеччыны, каб прымусіць яе быць болей падатлівай. Вось дзеля чаго

„... польскі імпэрыялістычныя парты, зарганізаваныя ў так званым хіенскім блёку, так пруцца да ўлады ў Польшчы, бо яны якраз зьяўляюцца выразьнікамі імпэрыялістычнай палітыкі Францыі на польскім грунце. Недарма і „Gazeta Warszawska“, і Rzeczpospolita“, і „Słowo Polskie“ расьпісываюцца пра неабходнасьць аружнай польскай інтэрвэнцыі проціў Нямеччыны яшчэ перад вырашэньнем Рурскага пытаньня“.

Адзначыўшы далей што і „вітасоўскія паско-пясты“ маглі-б таксама як і абшарнікі з капіталістамі пажывіцца пры гэтым і дзеля таго стараюцца якнайхутчэй зьдзейсьніць гэты саюз з Хьенай, які зьяўляецца

„..... трыумфам рэакціі—трыумфам ваенай палітыкі над мірнаю. Трыумфам павялічэньня уціску і вызыску работніцкай клясы, як у гарадох, так і на вёсках“.

Вось дзеля чаго

„Візыт маршалка Фоша азна-

чае кантроль Францыі на сколькі Польшча спраўляецца з роляй ваеннага саюзьніка на усходзе Эўропы, на сколькі 400 мільённая „пазычка“ на ваенныя мэты—была адпаведна выкарыстана для ўмацаваньня польскага мілітарызму, а тым самым для ўмацаваньня ваенных сіл Францыі“.

Патрэбнасьць клясавай сьвядомасьці сярод сялянства.

Кожны чалавек належыць да якой-небудзь клясы; так напр., пан абшарнік ці капіталіст належыць да клясы панскай ці буржуазнай; работнік, што працуе на фабрыцы ці заводзе,—да рабочніцкай клясы ці іначай пралетарскай. Да якой-жа клясы належыць сялянін? Пэўна ж ня ўсе сяляне належаць да аднэй клясы: ёсьць сяляне багатыя, што маюць шмат зямлі і самі ня могуць абрабіць яе, а каб вясьці сваю гаспадарку наймаюць работнікаў, і ёсьць сяляне беднякі, якія мала маюць сваей зямлі альбо і зусім ня маюць — арандатары чужых земель, парабкі; такі селянін сваей працай вядзе гаспадарку і, каб пракарміць сябе і сваю сям'ю, прымушаны ісьці на заработкі да пана-абшарніка ці свайго суседа—багатага сяляніна. Як бачым, інтарэсы ўсіх сялян не аднолькавы і залічыць іх да аднэй клясы ня можна. Сяляне беднякі маюць такія-ж інтарэсы, як і работнікі фабрык і заводаў, што жывуць у гарадох і дзеля гэтага яны належаць да аднэй з імі клясы—да клясы працоўнага люду, да клясы пралетарскай.

Сьвядомасьць да якой клясы хто належыць рэч надта важная і кожны селянін павінен гэта добра ўцяміць. Людзі, якія належаць да аднэй клясы і маюць супольныя інтарэсы, каб бараніць іх злучаюцца ў свае клясовыя арганізацыі. Найляпей зарганізаваны паны-абшарнікі і капіталісты; яны цесна злучаны ў моцныя арганізацыі, каб трымаць уладу ў сваіх руках, каб бараніць сваю ўласнасьць, каб лягчэй эксплёатаваць работнікаў і сялян, якія прымушаны прадаваць ім сваю працу, якія гэтай працай стварылі ўсё іхнае багацьце. Таксама добра зарганізаваны і работнікі ў гарадох, каб абараніць свае правы перад працадаўцамі. І дзеля гэтага становішча гарадзкога пралетарыяту шмат лепшае, чым сялянскай бедныты. Найгорш у нас зарганізавана сялянства. Вось-жа кожны селянін павінен зразумець, што толькі моцнае клясовая арганізацыя абароніць яго ад безпашчаднага вызыску пана-абшарніка, сяляніна-кулака, ці прыбыша-асадніка.

Адзін у полі ня воін — кажа прыказка. Кожнага бедняка паасобку задушыць магутная сіла капіталізму; увесь дабрабыт пана-абшарніка будуецца вызыскам працы найміта-парабка. Абеднанай сіле капіталізму трэба праціваставіць абеднаную згодную сілу прыгнечаных працоўных мас. А гэтая абеднаная згодная сіла шмат можа чаго зрабіць. Возьмем такі выпадак. Паны-абшарнікі пяшчадна эксплёатуюць працу сваіх работнікаў, плацяць марныя грошы і прымушаюць іх жыць і працаваць у нездаровых антысанітарных варунках. Зусім справядлівых вымаганьняў работнікаў яны адмаўляюцца выпаўніць. Тады клясавая арганізацыя сялянскай бедныты выносіць пастанову: ніхто не павінен стаць да працы, пакуль усе нашыя жаданьні ня будуць споўнены. У такім разе *пан прымушаны будзе выпаўніць усе дамаганьні*, бо іначай уся ягоная гаспадарка змарнуецца: скажам, прышлі жніва, і, калі ніхто ня пойдае на работу, дык праз нейкі час усё асыплецца, і ўласьнік панясе вялізарныя страты.

Бязумоўна трэба ведаць, што такія забастоўкі дадуць толькі тады пажаданыя вынікі, калі ўсе сяляне дружна, як адзін чалавек, будуць стаяць за свае справядлівыя дамаганьні, што паміж іх ня знойдзецца здраднікаў, якія за панскую ласку гатовы прадаць інтарэсы сваіх братоў. Дзеля гэтага арганізацыя павінна быць добра падрыхтована да гэтай важнай акцыі, трэба, каб у арганізацыі панавала моцная дысцыпліна і ўсе сябры выпаўнялі загады сваіх выбарных урадаў. Трэба рабіць адлічкі ў забастовачны фонд на той выпадак, калі забастоўка доўга працягнецца, каб выдаваць грашавыя ці якія іншыя дапамогі сваім сябрам на час трываньня забастоўкі і г. д.

Дый ня толькі ў гэтым праяўляецца сіла арганізацыі. У кожным выпадку непаразуменьняў з працадаўцамі сябра зможа знайсьці дапамогу і параду ў сваей арганізацыі; пры заключэньні дагавораў з працадаўцамі трэба зноў выступаць усім супольна і дамаўляцца агулам, а не па аднаму і г. д. Клясавая арганізацыя будзе так-сама усьвядамляць сваіх сябраў, шырыць сярод іх як агульна-прасьветную, так і прафэсыянальную веду, змагацца з бесправным палажэньнем нашага сяляніна і бараніць яго перад самавольствам „касуków kresowych“, прывучаць яго да сьвядомага грамадзкага жыцьця.

Мы не павінны забываць, што рана ці позна ўлада пяройдзе ў рукі працоўнай клясы; працоўнаму сялянству трэба падгатавацца, каб ён мог узяць гэтую ўладу сьвядома і выкарыстаць яе для ўласнага і агульнага дабра, дзеля гэтага трэба прайсьці салідную палітычную школу, а такой школай і ёсьць *прафэсыянальная клясавая арганізацыя*.

Нашае беларускае сялянства, якое знаходзіцца ў найгоршых варунках істнаваньня павінна стаць на гэты шлях клясавага змаганьня, дзеля вызваленьня з пад ярма эксплёататараў—чужынцаў паноў-абшарнікаў; дзеля выхаду на шырокі шлях творчай вольнай працы.

Ня можам тут ня адзначыць таго сумнага зьявішча, што нашая інтэлігенцыя да гэтага часу так мала зварочвае увагі на неарганізованнасьць нашага сялянства. Усе добра адчуваюць патрэбнасьць гэтай арганізацыі, якая вызваліла-б наш народ з сацыяльнага эканамічнага і нацыянальнага уціску. Але дагэтуль нічога ня зроблена. Хай-жа наша інтэлігенцыя, вышаўшая з самай глушы прыгнечанага сялянства і добра разумеючы ўсе патрэбы яго, возьме на сябе пачын стварэньня такой арганізацыі і клясовага усьведамленьня сялянства.

Стварэньне сялянскага клясавога прафэсыянальнага саюзу хай будзе неадкладным заданьнем дня!

Я. Л—віч.

Да нашых чытачоў і падпісчыкаў.

„Новае Жыцьцё“ адзіная ў Заходняй Беларусі беларуская газэта, якая стаіць у абароне інтарэсаў працоўнага сялянства і рабочых.

Кожны сьвядомы беларус павінен чытаць, распаўсюджываць, выпісываць і дапамагаць сваей газэце.

Сучасная ўсё ўзрастаючая дарагавізна стварае цяжкія варункі для выданьня газэты. Ад грашовага падтрыманьня праз беларускае грамадзянства залежыць рэгулярны выхад нашай часопісі.

Рэгулярна ўнасіце падпіску і даплату.

Амэрыканскія беларусы неадкладна і рашуча павінны падтрымаць „Новае Жыцьцё“, каб не ўпаў беларускі сьцяг на бацькаўшчыне.

Рэдакцыя і адміністрацыя.

Аб моцных нэрвах.

Вільгэльм II ў пачатку сусьветнае вайны сказаў, што пераможа той, у каго будуць мацнейшыя нэрвы.

Хоць ў аружнай барацьбе гэта і ня зусім апраўдалася, аднак, у барацьбе палітычнай кайзэраўскія словы — словы запраўды справядлівыя. Іх мы і павінны прыняць сур'ёзна пад увагу, калі будзем разважаць аб палітычнай барацьбе, што вядзе беларускі народ.

Разглядаючы цэлы рад крокаў, якія за апошнія часы зроблены нашымі ворагамі, мы ясна бачым, чаго яны стараюцца дайсьці. Мэта іх—як-раз іграць на нашых нэрвах, пазбавіць нас духовага супакою і раўнавагі і тады ўжо, абязьсіленых, пабіць.

Дзеля гэтага, з аднаго боку, арганізуюцца рабскія выступленьні панскіх наймітаў кшталтам Балаховічаў, Дубейкоўскіх, Міткевічаў і Хведашчэняў, разьлічаныя на тое, што беларускі народ, абураны да глыбіні душы падобнай нізасьцяй, выявіць у самай вострай форме свой пратэст проці фальшаваньня яго настрояў і імкненьняў. Адначасна, каб „падагрэць“ без пары настрой масаў, эндэкі пускаюць у сваіх часопісях весткі імі самімі выдуманыя, аб пастанове беларускіх паслоў зрабіць сёньня-ж паўстаньне. Урэшце, розныя правакатары, кшталтам Ленкевіча, выкрыўшага т. зв. „беларускае паўстаньне“ (цяпер аб гэту справу йдзе якраз суд у Беластоку), стараюцца выкарыстаць нездавольства нашых народных масаў, убіваюцца ў беларускія опозыцыйныя групы і пасьля на іх даносяць.

Усё гэта робіцца з аднэй думкай, з аднэй мэтай: сіць на нэрвах народу. У нэрвовай атмасфэры заўсёды магчымы бесплановыя выбухі, якія нічога не даходзяць, а толькі аслабляюць народную сілу. А сіла народу — ня ў выкрыках, ня ў чужых фразах, а ў *арганізацыі*.

Вось, у цяперашні пэрыад нашае барацьбы за самае істнаваньне, за самы нацыянальны быт беларусаў арганізацыя мае асаблівую вагу. Гэта—адзіная легальная, дапушчаная законам дарога. Болей таго: гэта адзіны спосаб захаваць моцныя нэрвы. Запраўды, толькі арганізаванае грамадзянства можа з усьпехам змагацца з усялякім беззаконьнем тых ці іншых агентаў улады, толькі ў арганізаванай грамадзе адзінкі могуць знайсьці для сябе патрэбную апору і помач, толькі праз арганізацыі народ можа ўпэўніцца ў тым, што ёсьць запраўдны ўсенародны кліч і што—правакацыя. І ўсё роўна, якая гэта будзе грамадзкая арганізацыя: ці то прасьветны гурток, ці каапэратыў, ці партыйны камітэт, — кожная форма арганізацыі дасьць нам тую ўнутраную моц, якая усьцеражэць нас ад нэрвовасьці і неабдуманых крокаў.

Усё добра ў свой час. Вось-жа і для кожнага нашага кроку, для кожнага нашага палітычнага выступленьня трэба выбіраць адпаведны час. Тое, што сёньня зьяўляецца непажаданым, заўтра, пры новых акалічнасьцях, можа аказацца самым разумным палітычным ходам. Але скуль-жа ведаць вясковаму народу, што і калі рабіць?

А вось-жа трэба прыслухоўвацца да голасу нашых цэнтральных грамадзкіх і палітычных установаў, трэ' слухаць прызыву кіраўнікоў нашае палітычнае мысьлі, якія ўжо пасьпелі выявіць сваё аблічча і заслужыць веру ў народу. Трэба разам з тым сьцерагчыся тых фальшывых прарокаў, якія сваё беларускае імя прадалі паном, каб баламуціць народ. Трэба пільна чытаць беларускія незалежныя часопісі, што, хоць і рэдка, даходзяць да нашых вёсак. Трэ' ўрэшце падтрымліваць пастаянную сувязь з тымі, каго народ выбраў за дэпутатаў у Сойм, каб тамака баранілі нашыя справы.

Арганізаваны народ, які мае дазнаных і верных яму павадыроў, — гэта такая сіла якой ня зломіць ніякая правакацыя, ніякі уціск і зьдзек. І мы да гэткае арганізацыі павінны імкнуцца ўсімі сіламі: яна дасьць нам і моцныя нэрвы, і пабеду.

Лаўрыновіч.

З усяе Беларусі.

Горадзеншчына.

Суседнія вёскі, Навасёлкі, Кубяльнікі і Пяскі, Масалянскае гміны, Горадзенскага павету, у якіх больш як 50 дзяцей беларусаў пажадалі заснаваць сваю родную беларускую школу. Згодна з фармальнасьцямі, напісалі заяву да п. школьнага інспэктара Гарадз. пав. аб выдачы дазволу на адкрыцьцё беларускае школы. П. інспэктар зьвярнуўся да гміны, каб яна агледзела будынак пад школу, школьны інвэнтар і дала адказ, ці ўсё гэта адпавядае гігіенічным вымаганьням для школы.

Але мясцовы ксёндз польскі шовіністы, як гэта ў нас усюды водзіцца, кіруе жыцьцём на вёсцы і верхаводзіць у гміне. Зразумела, што нам беларусам тут ужо не жыцьцё, а пекла. „Аб беларускай школе ня можа быць мовы“, сказаў ксёндз і сталася па волі пастыра душ.

Відаць, што гэта падабалася і п. інспэктару, бо калі прадстаўнік ад сялян падкрэсліў яму злую волю ксяндза і пажадаў выразнага выясьненьня справы, дык ён пачаў круціць, муціць і пусхаць канцы ў воду.

Калiж сяляне пачалі дамагацца хоць прыватнае беларускае школы, пан інспэктар пажадаў кваліфікацыі вучыцялькі, якая мела вучыць ў гэтай школе, дык пры зьбіраньні даных аб вучыцяльцы, відаць так сама п. ксёндз закінуў слаўцо, якое мела шкодны уплыў на кваліфікацыю, з павоаду чаго сяляне не атрымалі дазволу на школу.

Аля хай ня трыумфуе ксёндз, што часовыя перашкоды яго затрымаюць нас.

Жадаючы школы для сваіх дзяцей ў роднай беларускай мове, мы, як мурашкі, будзем працаваць ў гэтым напрамку; — другімі дарогамі пойдзем а дабʼемся сваго, бо ў барацьбе здабудзем мы права сабе.

Він.

Яльцоўшчына, Ваўкавыскага пав.

9 красавіка г.г. віталі тутака вялікіх гасьцей. Прыехалі сюды нашы паслы з Сойму Уладзімер Каліноўскі і Фабіян Ярэміч. Сабралася вялікая грамада сялян з суседніх вёсак, як: Мацкеўцы, Паўлоўшчына, Нізанкі, Казейкі, Загор'е, Яльцоўшчына, дв. Нізаны і інш., і са сьлязамі радасьці на вочах віталі дарагіх і так пажаданых гасьцей. Пасьля прамовы пасла Ф. Ярэміча, вялікую прамову сказаў У. Каліноўскі, ў якой інфармаваў аб працы ў Польскім Сойме Беларускага Пасольскага Клюбу, аб яго тактыцы і г. д. Пасьля прамоваў, як гарох, пасыпаліся ўсялякія скаргі і рожныя запытаньні. А пытацца было аб чым, было аб чым і жаліцца! Пакуль што найболей балючае і найболей важнае —гэта пытаньне аб зямлі. Як выясьнілася, шмат зямлі ў нашым павеце аддалі мазуром, а тутэйшае сялянства ў большасьці цярпіць аб малазямельнасьці, а то і безьзямельнасьці. Другое ня менш важне пытаньне—гэта аб адбудове. У той час, калі вышэйзначаныя вёскі ды йшчэ Харужанцы, Улезлы, Мітрані і Малая Лажніца — згарэлі ў 1915 г. ад вайны і дагэтуль не адбудованы, а людзі жывуць у будах, ямах і інш.,—найбліжэйшыя абшарніцкія лясы з вялікім пасьпехам дзень і ноч вывозяцца на станцыю да Ваўкавыска дзеля адпраўкі за граніцу. Гаварылі і аб павятовым бюро адбудовы, дзе па другім годзе ляжаць паданьня амаль, усіх сялян, і ні то што дрэва на будоўлю, але нават і адказу ніякага ня даюць, а калі хто стане дамагацца, дык выразна кажуць: „дай—дык будзе дадзена!“

Трэцяе так сама важнае пытаньне было аб вясеньнім пасеве. Прышла вясна, а тут у большасьці нашых сялянхлебаробаў ні зернятк а на насеньне, ні коніка, ні якусенькіх прыладаў земляробскіх—вось і сей, калі хочаш! Гаварылі і аб родных школах, што дзе якая была, дык разагналі (Малая Лапеніца), а Казейкі, Яльцоўшчына, Паўлоўшчына, Загор'е і Кізанкі тры разы прасілі інспэктара аб беларускую школу, дык ні то што беларускае, але ніякае ня хоча адчыніць.

Скардзіліся і на тое, што адміністрацыя гняце нас без пашчады. Як толькі прасочаць дзе сьвядомага беларуса-інтэлігента, ды зьнюхаюць у яго беларускую (хаця-ж легальную) літэратуру, дык зараз-жа пан стараста Ваўкавыскі А. Ныко загадывае паліцыі зрабіць рэвізію, канфіскаваць літэратуру, а часамі і самога арыштаваць. За прыклад можа паслужыць гэтакі факт: леташняга году ў вялікодны чацьвер зрабілі рэвізію ў гр. Сьцяпана Шчыглінскага з Баярычыны, канфіскавалі ўсю літэратуру ды яшчэ колькі разоў цягалі на сьледзтва і да гэтай пары не зьвярнулі канфіскаванага.

Жаліліся сваім заступнікам і на несправядлівасьць: што як сваім — мазуром-каляністам-асаднікам—дык усенька ёсьць: і зямля, і коні, і грошы, а ты, беларус, сам у сваім ня волен. Усё гэта гаварылі людзі, а паслы . . . слухалі і абяцалі, што ўсю сілу паложаць, каб толькі дабіцца лепшай далі брату-гарапашніку.

А калі паслы селі на воз і сказалі гарачымі словамі—бывайце здаровы—натаўп доўга, доўга стаяў, зьвярнуўшы пагляд у той бок, у які павозка унясла так рэдкіх і дарагіх гасьцей. Пасьля разыходзячыся шапталі, каб гэтак часьцей спатыкацца.

Сьцяпан Баярскі.

м. Баранавічы.

Яшчэ у 1919 годзе, калі Баранавічы былі заняты польскімі войскамі, быў „выбраны“ магістрат. „Выбіралі“ магістрат не Баранавіцкія жыхары, а сам стараста. Ён выбраў тых каго хацеў, усіх разам 24 радных. Цяпер асталося

у гэтым „выбраным" магістраце толькі 16 радных, з іх 7 жыдоў і 9 хрысьціян. Назначанага на месца бурмістра п. Тэраевіча так сама ужо няма, бо яго усунулі з пасады і аддалі пад суд за неймія непарадкі. Абагнавлі яго да апошняга часу спаўняў Баранавіцкі жыхар гр. Яроцкі Юры, які ня зусім візаць падабаўся п. Баранавіцкаму старасьце і вось нядаўна па загаду п. старасты адбыліся перавыбары заступніка Баранавіцкага старасты. Стараста высунуў кандыдатуру некага п. Модлінскага, паляка з Сувалшчыны. Разбітыя на паасобныя групы радныя не згаварыліся і п. Модлінскі абазаўся выбраным. Адразу-ж ён патрэбаваў ад магістрату гарантыяў: пэнсі па 3.000 000 у месяц і выплаты яе ў працягу 6 месяцаў, у выпадку калі б новы бурмістр быў выбраны раней 6 месяцаў.

За п. Модлінскага галасавала 7 жыдоў і вікаторыя хрысьціяне.

Дзіўна, дзіўна, што сярод 25—30 тысячаў Баранавіцкага насяленьня не знайшлося кандыдата на заступніка старасты. Яшчэ-ж дзіўней, што стараста, што хоча, то і робіць у магістраце.

Шарскі.

Случчына.

Лектарскае бюро.

Гэтымі днямі ў Слуцку заснавалася лектарскае бюро, маючае на мэце культурна-асьветныя заданьні сярод сяброў прафэсыянальных саюзаў і наогул сярод насяленьня м. Слуцку. Разам з тым лектарскае бюро мае абслугоўваць і ўсе тыя гурткі камісіі школьнікаў і дашкольнікаў, якія закладваюцца ў Слуцку і маюць канцэнтравацца вакол дому працаўнікоў асьветы, які нядаўна пачаў арганізавацца ў Слуцку. У бюро ўвайшлі ўсе лепшыя школьныя працаўнікі м. Слуцку. Ужо некалькі лекцыяў прачытана ў партыйнай школе для вучняў і для сяброў саюзу савецкіх працаўнікоў.

З беларускага жыцьця.

✦ Пастановай Сыноду Праваслаўнае Мітраполіі ў Польшчы на Віленскую катадру назначан Архіэпіскап Хвядос, б. Смаленскі, які не так даўна вярнуўся з Расеі.

Цяперашні часова кіруючы Віленскай эпархіяй эпіскап Аляксей назначан эпіскапам Гародзенскім і Навагрудзкім.

Навінкі ў беларускай літэратуры.

Хутка выйдзе з друку навая п'еса Ф. Аляхновіча „Пан міністар", у трох актах.

М. Гарэцкі напісаў вялікае апавяданьне ў дыялягічнай форме „Уцекачы".

✦ 13 траўня у залі Драматычнай майстроўні адбыўся вечар, ладжаны вучнямі Беларускай гімназіі на карысьць незаможных вучняў гімназіі. Пастаўлена была маленькая музыкальная п'еса „Дзед і Баба" і канцэртнае аддзяленьне, у якім выступаў С. Бенoні Пажадана, каб дэклямацыя на другі раз была больш удалаю, як на гэтай вечарыне. Публікі было шмат, якая шчыра вітала кожнае выступленьне на сцэне.

У Віленскай Беларускай Гімназіі.

Не так даўна вярнуўся з Варшавы Дырэктар Віленскае Беларускае Гімназіі п. А. Трэпка, куды ён ездзіў на справах фінансовае дапамогі гімназіі і экзаменаў на матуру.

Віцэ Міністар прасьветы, які прыймаў яго, абяцаўся даць грашовую дапамогу. Што датычыць правоў для вучняў, то Віцэ-міністр заявіў, што сёлета яшчэ разліч́ацьна гэта нельга, дзела таго, што міністэрства яшчэ не мае дакладнага прадстаўленьне аб падагогічным становішчы гімназіі, але гэтае пытаньне зусім не выключана для наступнага школьнага году.

Пэдагогічная Рада Гімназіі, канстатуючы той факт, што вучні 8-ае клясы досыць добра падгатаваны з усіх прадметаў, пастанавіла зрабіць сёлета выпускныя экзамены у 8 кл. па ўсіх тых навуках, па якіх вымагаецца экзамен на матуру па праграму, выдазенаму куратарам Віленскага Школьнага Вокругу.

Заняткі ў гімназіі скончацца 20 чэрвеня.

„Саха" закрыта.

Рэдакцыя беларускага тыднёвіка „Саха" 16 гэтага траўня адтрымала ад Камісара Ураду на м. Вільны афіцыяльнае па ведамленьне аб тым, што па пастанове суду пастанаўл 25 мінулага красавіка Акружны Суд пастанавіў зацьвердзіць арышт, накладзены на № 4 сказанай часопісі і зыкрыцьця яе да часу выдаваньня рашэньня па гэтай справе.

Тэатр і мастацтва.

Беларускі артыста М. Шчаснович у хуткім часе мае паставіць некалькі канцэртаў на беларускай мове. Будуць выпаўнены цэлыя акты і арыі з опэраў „Дэмон", „Мазэпа" і інш.

Ужо робіцца пераклады на беларускую мову з лібрэтто пры удзеле выдатнейшых беларускіх літэрацкіх сіл.

Выступаць мае вядомы опэрны артыста Сяргей Бэноні—basso-cantante.

Беларусы у Амэрыцы

Амэрыканская прэса аб Беларусі.

Апошнімі часамі выходзячая ў Чыкаго расейская газэта „Свабодная Россия" удзяляе многа месца беларускаму руху і падае багата матар'ялу з жыцьця на Бацькаўшчыне. Беларускія дзеячы робяць стараньні, каб узнесьці іншай прэсе пісалося многа аб Беларусі.

Помач Бацькаўшчыне.

Місія Др. Нансена помачы галодным у Расеі, Украіне і Беларусі запранавала Беларускаму Камітэту ў Чыкаго ўзяць прадстаўніцтва на перасылку з Чыкага пасылак у Сав. Беларусь. Справу гэту ў найбліжэйшым паседжаньні Камітэт вырашыць.

Аб беларусах у Піттсбургу.

Беларусы у Піттсбургу запрасілі грам. Я. Чарапука прыехаць дзеля прачытаньня лекцыі аб беларускім руху. Такія лекцыі былі прачытаны гр. Я. Чарапукам у Чыкаго і інш. мейсцах Амэрыкі.

Беларусы і Украінцы.

Паміж украінцамі і беларусамі ў Амэрыцы вядуцца перагаворы аб супольнай дзейнасьці ў змаганьні за незалежнасьць Украіны і Беларусі. Па гэтаму пытаньню самая ўплывовая ў Злучаных Штатах Украінская газэта „Свобода" № 93 памясьціла перадавую стацьцю, у якой падробна абгаварвае сучаснае палітычнае становішча Беларусі і Украіны, заканчваючы такімі славамі: „Абодва Народы цяпер будуць стаяць у супольнай барацьбе процiў супольнага ворага, што раз дык больш будуць пазнаваць, а з той прыязні на будучыне, па асягненьні волі, можа ўнесьці і украінска-беларускі саюз дзеля далейшай абароны супольных інтарэсаў.

Народныя работнікі сярод абоіх народаў павінны, як найхутчэй знайсьці дарогу і спосабы дзеля ўзаемнага паразуменьня і дзейнасьці і як найхутчэй па чаці супольную працу.

З Мэнску.

Пятнадцацехгадовы юбілей літэратурнай працы Галубка.

У нядзелю, 29 красавіка, у Цэнтральным Доме Працаўнікоў Асьветы адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне пятнадцацёхгадовай працы беларускага пісьменьніка Галубка. Заля была поўна публікі. Першым вітаў Галубка гр. Каранеўскі ад імя Народнага Камісарыяту Асьветы. Ён адзначыў тую шчырую і бляскучую працу, якую вёў Галубок на інструктарах НКА.

Ад імя праўленьня Унівэрсытэту вітаў юбіляра рэктар Унівэрсытэту праф. Пічэта. Ён адзначыў значэньне твораў Галубка, якія ўвайшлі ў лік п'ес, лёгкых у фундамант беларускага рэпэртуару. Далей ён адзначыў тыя цяжкія умовы, пры якіх Галубок пачынаў сваю працу. Гэта было ў тыя часы, калі царскі Урад душыў усё беларускае.

Праф. Замоцін адзначыў, што крытыка часта вельмі незаслужана нападала на творы Галубка, але ўсёжткі адзначала іх сцэнічнасьць. Усе творы Галубка мала падходзяць пад мерку літэратурных, але затое адзначаюцца сваёй сцэнічнасьцю. А гэта вельмі важна для пастановак на вясковых сцэнах.

Далей выступаў прафэсар Пятухові́ч ад імя інстытуту Беларускай Культуры выступіў беларускі пісьменьнік Якуб Колас.

Гр. Ахрамовіч ад імя Саюзу Працаўнікоў Асьветы адзначыў вялікую працу, зробленую Галубком для вёскі.

Віталі юбіляра прадстаўнікі студэнцтва: ад БДУ — Апацёнак, ад Інстытуту Сельскай Гаспадаркі — Пасярэбка. Служачым Белпадзьхвёкуму Александро віцам быў падвесёны юбіляру адрас.

Ад імя II бел. трупы, кіраўніком якой зьяўляецца юбіляр, вітаў Галубка гр. Грыблят.

На ўсе прывітаньні Галубок адказываў з вялікім пачуцьцём.

Пасьля прывітаньняў артыстамі II беларускай трупы была выканана п'еса Галубка „Ганка".

А. Зьніч.

Усячына.

Сьвінская справа.

Польскія газэты падаюць казатлівыя весткі аб тым, што пасол Вінцэнты Вітас у свой час зьвярнуўся да старшыні міністраў ген. Сікорскага аб дазволе на вываз за граніцу 10.000 сьвіней Малапольскаму Сельска-гаспадарчаму Т-ву, старшыняй якога зьяўляецца Вітас. Сікорскі адмовіўся, ссылаючыся на існуючыя законы, забараняючыя вываз прадуктаў першай патрэбы за граніцу. Гэта не спадабалася Вітасу і, як піш уць некаторыя газэты, паслужыла прычынай заключэньня хьенска-пястоўскага саюзу, каб падлажыць ген. Сікорскаму... сьвіньню...

Сонца астыгае.

Амэрыканскія астраномы і іншыя вучоныя даказываюць, што сонца цяпер не даець столькі цяпліні і сьвету як некалькі гадоў таму назад.

Д-р Эбот представіў самыя апошнія досьледы над сонцам, з якіх відаць, што сонца цяпер даець на 3 працэнты меней цяпліні як год з лішкам таму назад. Вучоныя даводзяць, што гэта і служыць прычынай доўгай сёлетняй зімы і халоднай вясны. Робяць дагадкі, што і лета будзе халоднае, а зімой страшныя марозы.

Але некаторыя астраномы даказываюць, што такое пахаладаньне ёсьць нерэгулярнае з'явішча на зямлі і што зноў наступіць цяпло. Выпадак такога пахаладаньня быў у 1816 г. калі ў чэрвені месяцы быў мароз і вымярзла шмат збожжа.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) Вільня, Віленская вул. 12 кв. 6.
2) Ліда, 11 Слабодка 8, сэкрэтар Калясінскі.
3) м. Глыбокае, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) Жодзішкі, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) Навагрудак, Вялікі Рынак 14, сэкр. Ян. Біруковіч.
6) Нясьвіж, Альбянская 28, сэкр. Ян Шнаркевіч.
7) Столбцы, Шпітальная 22, Г. Сабалеўскі.
8) Баранавічы
9) Горадня, Мастовая 9
10) Ваўкавыск, Цяховая 14.
11) Бельск, Замковая вул. 3, кв. 1 сэкр. Канстанты Карыцкі.
12) м. Саколка, Горадзенскага вул. 34.
13) м. Нлешчэлі Бельск. павету.
14) м. Крынкі, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.
15) Пружаны. Вул. кс. Буткевіча, 16